# ЖАНРАВАЯ ПАРАДЫГМА ПАЭЗІІ ЯНКІ ЛУЧЫНЫ

**В. В. Круглова**

Жыццё Янкі Лучыны прыпала на час нацыянальнага прыгнёту беларускага народа. Асабліва востра нацыянальная праблема паўстала пасля паўстання 1863-1864 гадоў. У гэты час узмацнілася русіфікатарская палітыка ў дачыненні да насельніцтва Паўночна-Заходняга края, афіцыйна было забаронена ўжыванне беларускай мовы. Але нацыя працягвала існаваць. Знайшліся людзі, якія сталі гуртавацца ў справе святога адраджэння паняволенага беларускага народа. Адзін з іх – Янка Лучына, якога не спалохалі цяжкія, амаль безнадзейныя ўмовы для пачынання творчай працы.

Паэтычную творчасць Янкі Лучыны нельга назваць вялікай [гл. табліцу]. «Але прычыну гэтага трэба шукаць не ў бясплоднасці таленту песняра, – пісаў Максім Багдановіч, – а ў агульным характары таго часу, на які прыпадае яго пісьменніцкая праца. На вялікі жаль, гэта былі нудныя 80-я і 90-я гады, калі ўсякая жывая справа зараз жа і заціскалася, калі грамадзянская думка крэпка спала, калі ўсё жыццё якась пашарэла і прынікла... Пры гэтых умовах пісьменніцкая праца не магла быць колькі-небудзь напружанай, што і адбілася на малым ліку твораў Неслухоўскага. Так і здаецца, што пісаліся яны "паміж сур'ёзнымі справамі", калі выдаваўся вольны час, і доўга яшчэ потым ляжалі ў скрыні песняра. Але гэтая маруднасць працы мела і свой добры бок: павэдлуг яе, паміж твораў Неслухоўскага няма пісьменніцкіх выкідышаў, каторыя так нярэдкі цяпер. Талент яго ўстаў перад чытачамі ва увесь свой рост» [1, т. 2, с. 183].

Творчым крэдам для Янкі Лучыны паслужылі радкі з верша Уладзіслава Сыракомлі, які ён пераклаў на беларускую мову:

Не я пяю – народ Божы
Даў мне ў песні лад прыгожы,
Бо на сэрцы маю путы
І з народам імі скуты [3, с. 160].

Пазнаёміўшыся з творчасцю Уладзіслава Сыракомлі, Янка Лучына зразумеў, што сапраўдны паэт павінен з'яднацца з народам, прамаўляць ад імя сялян. Матывам яднання з народам, спачування сялянам, павагай да простага люду, пошукам выйсця з цяжкага становішча прасякнута ўся творчасць Янкі Лучыны. У яго творчасці няма сацыяльна-псіхалагічнага бар'еру паміж гараджанінам і селянінам. Творы Янкі Лучыны – гэта рух насустрач народу, глыбокае пранікненне ў псіхалогію селяніна.

*Табліца*

**Жанравая колькасць вершаў**

| Від лірыкі | | Грамадзянская | Пейзажная і грамадзянская | Пейзажная | Пейзажная і інтымная | Філасофская | Інтымная і філасофская | Інтымная | Інтымная і грамадзянская |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Беларускамоўныя вершы | Арыгіналы | 5 (37%) | 6 (42%) | | 1 (7%) | | | | 2 (14%) |
| | Пераклады | 2 (40%) | 1 (20%) | | | 1 (20%) | | 1 (20%) | |
| Польскамоўныя вершы | Арыгіналы | 5 (13%) | 7 (19%) | 5 (13%) | 3 (8%) | 7 (19%) | 4 (11%) | 5 (13%) | 1 (2%) |
| | Пераклады | 2 (29%) | | 2 (29%) | 1 (14%) | 1 (14%) | 1 (14%) | | |
| Рускамоўныя вершы | Арыгіналы | 1 (33%) | | | | | | 2 (67%) | |
| | Пераклады | 1 (20%) | | | | 3 (60%) | | 1 (20%) | |
| Усе вершы | | 16 (22%) | 14 (20%) | 7 (10%) | 5 (7%) | 12 (17%) | 5 (7%) | 9 (13%) | 3 (4%) |

З-за немагчамасці друкавацца на беларускай мове, большасць паэтычнай спадчыны Янкі Лучыны складаюць польскамоўныя творы. Беларускія вершы ўзніклі пад уражаннем выступлення ўкраінскай трупы пад кіраўніцтвам Міхайлы Старыцкага ў Мінску ў 1887 годзе. Тагачаснае палітычнае і сацыяльнае становішча ва Украіне было падобна да сітуацыі ў Беларусі: нацыянальны прыгнёт, беднасць. Але ў суседняй краіне нацыянальны ўздым пачаўся раней. Украінскі тэатр падаў прыклад нацыянальнай самавыявы на роднай мове, падштурхнуў паэта да магчымасці стварэння вершаў на беларускай мове. Першыя

беларускія творы – «Усёй трупе дабрадзея Старыцкага...» і «Дабрадзею артысту Манько» – Янка Лучына прысвяціў украінскім гасцям. Такім чынам, беларускі паэт падтрымаў пачатак нацыянальнага адраджэння ў суседняй краіне і сцвердзіў яго ў сваёй.

Важнае месца ў творчасці Янкі Лучыны займае грамадзянская лірыка. Паэт надзвычай сур'ёзна ставіцца да сваёй творчасці. Галоўнае для яго – каб песня мела глыбокі змест, не была пустой.

У вершы «Лірнік вясковы» («Lirnik wioskowy»), прысвечаным Уладзіславу Сыракомлю, Янка Лучына асуджае грамадства, якое не жадае звярнуцца да роднай песні. Аўтар шкадуе аб непазбежнасці маральных страт, але верыць у «сілу глыбінную» роднай песні, якая з'яўляецца сувяззю з даўнімі айчыннымі традыцыямі.

Патрыятычная тэматыка, дорба распрацаваная Уладзіславам Сыракомлем, знайшла працяг у творчасці Янкі Лучыны. Любоў да Радзімы і яе народа паэт часта перадае пры дапамозе пейзажу.

У вершы «На перавозе» («Na przewozie») лірычны герой выказвае любоў да радзімы, а разам з тым і расчараванне з-за беднасці краю. Янка Лучына супрацьпастаўляе Нёман, як увасабленне радзімы, чужым рэкам. Бедная радзіма лепш за багатую чужыну, бо яна свая.

У «Пышным малюнку» («Pyszny widok») паэт са здзіўленнем і вялікай пачуццёвасцю апісвае непаўторную прыроду Каўказа. Але наплыў пачуццяў выкліканы не маляўнічасцю наваколля, а ўспамінамі пра свой родны кут: нягледзячы на далёкую адлегласць у прасторы, радзіма ўсё роўна ўяўляецца паэту бліжэй.

З вобразам радзімы ў Янкі Лучыны асацыіруецца вобраз мужыка. У творы «Роднай старонцы» паэт праўдзіва адлюстроўвае цяжкае становішча беларускга селяніна і яго адданасць радзіме:

Усё ў табе бедна. Часта заплача
Мужык араты дзеля злой долі,
Цяжка працуючы, ён жа, аднача,
З табой расстацца не жджэ ніколі [3, с. 27].

Янка Лучына пераносіць лёс народа і яго грамадскія памкненні на прыроду. Так, напрыклад, у вершы «Не хачу памерці» («Ja umierać nie chcę») паэт атаясамлівае беларуса з ссечанай бярозкай, загнаным аленем, а лёс – са змрочным небам.

Надзею на шчаслівую долю паэт звязвае з вобразам вясны. Вясна і ў паэзіі рамантыкаў часта паўстае як новы этап у жыцці. У творах «Прадвесне» («Przedwiośnie») і «Вясна» аўтар пераносіць чаканні добрага лёсу на чаканне вясны:

От, толькі на сэрцы нейк людзям больш лёгка,

Што спалі зімы ўжо кайданы,
Але шчэ сягоння вясна, ой, далёка,
Шчэ спяць і лясы, і паляны [3, с. 102].

Прыгнёт беларускага насельніцтва Янка Лучына атаясамлівае з вобразам мароза. У вершы «Мароз» («Mróz»), каб узмацніць засілле холаду, аўтар падкрэслівае, што той «мінаў у паходзе палацы багатых», «скіроўваў сілы да беднае хаты».

У сувязі з цяжкім матэрыяльным і духоўным становішчам беларускага народа ў паэта не маглі не ўзнікнуць некаторыя пытанні, што датычацца сэнсу жыцця і адносін асобы да яго. Значнае месца ў творчасці Янкі Лучыны займае філасофская і інтымная лірыка.

У вершы «Што люблю?» («Co lubię?») Янка Лучына стварае вобраз эпікурэйскага ладу жыцця, які дапамагае забыцца пра душэўны боль. «Страла, выпушчаная ўдаль імкліва» з’яўляецца сімвалам свабоды.

У творчасці Янкі Лучыны зусім нямнога вершаў любоўнай праблематыкі. Гэта можна патлумачыць самаадданным служэннем народу, унутраны свет якога для паэта быў больш важны, чым асабісты.

Адзін з твораў – «Сэрэнада» («Sierenada»). Серэнада была распаўсюджана ў Сярэднявечча і ў эпоху Рэнесансу, а Янка Лучына ўвёў гэты верш у беларускую літаратуру.

Янка Лучына шчыра, без ніякай стылізацыі распавядае пра становішча беларускага сялянства, выказвае свае погляды на жыццё. Яго творчасць садзейнічала духоўнаму развіццю насельніцтва Паўночна-Заходняга края, абуджала нацыянальную самасвядомасць беларусаў. С. К. Майхровіч пісаў: «Паэзія Янкі Лучыны, будучы жывым увасабленнем “чорнай нядолі” прыгнечанага самаўладствам народа, садзейнічала абуджэнню грамадскай самасвядомасці і нацыянальнай годнасці працоўных мас, раскрывала крыніцу “дум маркотных” народа, адлюстроўвала яго ўнутраны свет» [4, с. 4].

**Літаратура**


1. *Багдановіч М.* Іван Неслухоўскі // М. Багдановіч. Поўны збор твораў у 3-х тамах. 2-е выд. Мінс, 2001.
2. *Лучына Янка.* Творы: Вершы, нарысы, пераклады, лісты / Уклад., прадм. і камент. У. Мархеля. Мінск, 2001.
3. *Майхровіч С.* Янка Лучына: Жыццё і творчасць. Мінск, 1952.